*УДК 821.161.3-344*

**Г. М. Мотуз**
***Навук. кір. – А. В. Брадзіхіна, канд. філал. навук, дацэнт***

# ВОБРАЗ ВАЎКАЛАКА Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ: СПЕЦЫФІКА ЎВАСАБЛЕННЯ

У дадзеным артыкуле разглядаецца генезіс і эвалюцыя вобраза ваўкалака ў прафесійнай беларускай літаратуры XIX – XXI стст. Найбольшая ўвага адводзіцца функцыянальным рысам гэтай міфалагемы ў мастацкім тэксце, яе ролі ў ідэйна-эстэтычнай канцэпцыі твора, выяўленню розных іпастасей вобраза лікантропа і фарміраванню традыцыі ў яго ўвасабленні або адхіленню ад яе.

---

У традыцыйных уяўленнях славян вераванні пра пярэваратніцтва, і ў прыватнасці пра ваўкалацтва, лікантропію, даволі распаўсюджаныя. Так, у палякаў ѐсць *wilkolek, wilkólak*; у чэхаў –*wilkodlak i wlkodlak*; у сербаў – *влколек, врколак і влколиjек*; у харватаў і баснійцаў – *vukodlak* і інш. У рускіх таксама існуе павер‘е аб *волколаках і вурколаках*. «Але больш за ўсіх славяна-рускіх і нават, наогул, славянскіх плямѐнаў можа пахваліцца шматлікімі павер‘ямі і апавяданнямі пра ваўкалаках Беларусь» [1, с. 243], – зазначае П. Шпілеўскі.

Прычым яшчэ Герадот згадваў таямнічае племя неўраў, якое мае непасрэднае дачыненне да тэрыторыі пражывання беларускага народа і ў старадаўнія часы звязвалася скіфамі і грэкамі з чарадзействам і здольнасцю людзей прымаць звярынае аблічча. Генезіс фальклорна- міфалагічнага вобраза ваўкалака бярэ пачатак у татэмізме, што ўказвае і на часовасць метамарфоз-пераўтварэнняў. Як правіла, ваўкалакі па сваім паходжанні бываюць двух тыпаў: чараўнікі, якія валодалі ўменнем часова перакінуцца ў ваўкоў з уласнай волі, і няшчасныя ахвяры абставін, пертвораныя ў звяроў у выніку магічных дзеянняў ведзьмакоў. Ваўкалакі-чараўнікі набываюць звярыныя рысы – драпежнасць і крыважэрнасць, нападаюць не столькі на жывѐл, колькі на людзей, высмоктваючы з іх кроў. Ваўкалакі-ахвяры зусім ручныя, як хатнія жывѐлы, яны не губляюць чалавечых пачуццяў і розуму. Адпаведна адносіны нашых продкаў да ваўкалакаў мелі дваісты характар: першых пабойваліся і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ненавідзелі, другім спачувалі і нават імкнуліся дапамагчы зняць закляцце і вярнуць чалавечае аблічча. А таму ваўкалак-ахвяра займеў трывалую сімволіку ў свядомасці беларусаў, увасабляючы татальную адзіноту, стаў адным з самых трагічных вобразаў беларускай дэманалогіі.

Найбольш відавочнай формай праяўлення міфалагічнага светаадчування ў прыгожым пісьменстве выступае, па словах С. Аверынцава і М. Эпштэйна, арыентацыя майстроў слова на «першапачатковыя, архетыпічныя канстанты чалавечага і прыроднага быцця» [2, с. 224]. На думку даследчыкаў, гэта выяўляецца ў актыўным звароце аўтараў да першавобразаў, а таксама прыёмах двайніцтва і «пярэваратніцтва» персанажаў.

Вобраз ваўкалака яшчэ пачынаючы з XIX стагоддзя нярэдка выкарыстоўваўся беларускімі паэтамі. Так, П. Багрым (верш «Зайграй, зайграй, хлопча малы…») і А. Абуховіч (байка «Ваўкалак») ідуць услед за фальклорнай інтэрпрэтацыяй гэтага міфалагічнага вобраза. Іх ваўкалакі – выключаныя з грамадства ахвяры абставін.

З другога боку, як і ў Я. Купалы («Паязджане»), А. Гаруна («Ваўкалакі») і У. Караткевіча («Балада пра паўстанца Ваўкалаку»), у згаданых вышэй паэтаў вобраз лікантропа ўтрымлівае грамадска- палітычныя алюзіі, хаця і не набывае яркага сімвалічнага значэння барацьбіта супраць несправядлівасці і прыгнёту. Так, у вершы Я. Купалы «Паязджане» перадаецца светадчуванне звычайнага чалавека, які ў выніку гістарычных катаклізмаў і ваеннага ліхалецця гвалтоўна быў вырваны са свайго натуральнага асяроддзя, спакойнага мірнага жыцця і вымушаны пакутліва шукаць прыстанку ў свеце. «Балада пра паўстанца Ваўкалаку» У. Караткевіча перадае душэўны стан героя ў яго апошнія хвіліны жыцця, што надае твору асаблівую лірычную пранікнёнасць. У вершы А. Гаруна «Ваўкалакі» міфалагічны вобраз ваўкалака ўвасабляе спрадвечныя ліха і прыгнёт.

Зусім інакшыя функцыі мае вобраз ваўкалака ў прозе. Фальклорна-міфалагічная традыцыя ў яго асэнсаванні бярэ вытокі з творчасці Яна Баршчэўскага (твор «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях») і знаходзіць свой працяг у XX стагоддзі. Цэнтральная міфалагема «Шляхціца Завальні…» Я. Баршчэўскага – чалавечая душа як галоўная каштоўнасць, што найбольш трагічна раскрываецца якраз на

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прыкладзе вобраза ваўкалака (часткі «Ваўкалак», «Вужыная карона»). У навеле «Вужыная карона» апавядальнік расказвае: «Сустракаем мы двух ваўкоў… Я бяру стрэльбу і хачу стрэліць. Януш павярнуўся да мяне і закрычаў: –Не страляй, пане, бо ў іх душы чалавечыя. Калі заб‘еш якога, дык душа ягоная пойдзе ў пекла, не адпакутаваўшы за грахі. А за гэта і пан адкажа перад Богам‖» [3, с. 71].

Матыў ваўкалацтва ўзнікае ў Я. Баршчэўскага неаднаразова, праз яго выяўляецца найперш адчуванне катастрафічнасці свету, народнае разуменне дабра і зла, жыцця і смерці, вера ў магчымасць перамяшчэння з чалавечага свету ў патубаковы. Пры гэтым, аднак, пісьменніку ўдалося амаль цалкам захаваць структуру міфалагемы: як і ў беларускай вуснапаэтычнай спадчыне, у творы Яна Баршчэўскага падаецца механізм ператварэння чалавека ў ваўкалака, ягоныя паводзіны ў звярыным абліччы. Фальклорна-рамантычную традыцыю ў асэнсаванні вобраза працягнулі А. Кажадуб (апавяданне «Ваўкалакі») і А. Каско (навела «Апошні ваўкалак»). Абодва аўтары засноўваюць сюжэты сваіх твораў на паданні пра ператварэнне ў ваўкалакаў вясельных груп, распаўсюджаным ва ўяўленнях беларусаў.

Цікавыя інтэрпрэтацыі набывае вобраз ваўкалака ў сучаснай гістарычнай прозе, у прыватнасці ў раманах «След ваўкалака» Л. Дайнекі, «Літоўскі воўк» А. Наварыча, «Князь-ваўкалак» М. Кутузава, «Дагератып», «Золата забытых магіл», апавяданні «Лікантроп» Л. Рублеўскай і інш. Вобраз ваўкалака тут, як правіла, не трансфармуецца, бярэцца ў нязменным выглядзе і ўзмацняе нацыянальна-гістарычны каларыт. Пры распрацоўцы філасофскай і маральна-этычнай праблематыкі пісьменнікі істотна пераасэнсоўваюць змест міфалагемы і выкарыстоўваюць іх або ў якасці метафары, або дзеля іранічнай падсветкі падзей.

Прыгодніцкая проза, скіраваная на падзеі сучаснасці, таксама нярэдка звяртаецца да вобраза лікантропа, які часам набывае тут нечаканае вырашэнне. Так, дэзерцір Леўка Грыцаў, які ў гады вайны прыслужваў немцам, а пасля перамогі схаваўся ў лесе, з аповесці «Цкаванне вялікага звера» А. Наварыча становіцца выгнанцам па ўласнай волі. Асудзіўшы сябе па адзінокае бадзянне па лясах і балотах, ѐн ператвараецца ў дзікага звера, прыбіваецца да

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

зграі ваўкоў і нават становіцца іх важаком. З самага пачатку твора прасочваецца дваістасць асобы героя. Звер, Важак, Гаспадар, Леўка Грыцаў – усѐ гэта адна асоба: «Ваўкі і не думалі вылазіць з асочанага лясочку. Тут, недалѐка ад рэчкі, было зацішна. Не ўпудзіліся звяры і тады, калі да лѐжкі прыцѐгся па іхніх слядах ваўчыны правадыр. Важак, якога яны не заўсѐды слухалі. Аброслы густым валоссем, пакрыты заміж шапкі дзіравай анучай чалавек апусціўся на калені» [4, с. 169]. Нягледзячы на падзагаловак «Палеская быль», у творы, відавочна, цесна пераплятаюцца рэалістычны і фантастычны пачаткі, што надае яму рысы так званай жывѐльнай рабінзанады. Па-новаму асвятляе тэму пярэваратняў А. Бычкоўскі ў апавяданні «Нашчадкі неўраў», ствараючы містычны дэтэктыў у гарадскім антуражы. У цэлым увядзенне вобраза ваўкалака дазваляе надаць прыгодніцкай прозе філасофскую глыбіню, узняць праблемы чалавечай адчужанасці, адзіноты ў соцыуме, супрацьстаяння дабра і зла.

У шэрагу твораў беларускай літаратуры ваўкалацтва прысутнічае не на ўзроўні вобразаў, а на ўзроўні ідэй. Непасрэдна вобраз лікантропа тут не выводзіцца, але ў цэнтры знаходзіцца ідэя трагічнай раздвоенасці, характэрная гэтай міфалагеме ў традыцыйных уяўленнях беларусаў. Так, у аповесці «Душа не ў сваім целе» Я. Баршчэўскага гэтая думка ўвасоблена ў вобразе лекара Саматніцкага з характэрным прозвішчам, у якім чытаецца асуджанасць на адзіноту. Калі Я. Баршчэўскі з дапамогай гэтага прыѐму паглыбляе свае грамадска-палітычныя алегорыі, то Ю. Станкевіч, звяртаючыся да ідэі трагічнай раздвоенасці, аддзялення душы ад цела ў сваіх творах-перасцярогах «Бесапатам», «П‘яўка»,

імкнецца вырашыць цэлае кола праблем: палітычных, гістарычных, эканамічных, нацыянальных і інш.

Такім чынам, вобраз ваўкалака – адна з самых запатрабаваных міфалагем у беларускай літаратуры XIX – XXI стст. Прычым калі ў паэтычных тэкстах пераважае фальклорная традыцыя ў яго ўвасабленні, празаікі дэманструюць арыгінальныя падыходы і рэалізуюць праз увядзенне ў твор лікантропа самыя разнастайныя функцыі: раскрываюць разнастайныя праблемы (нацыянальна- адраджэнскія, філасофскія, маральна-этычныя), паглыбляюць псіхалагізм, узмацняюць займальны пачатак і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## Спіс літаратуры

1 Шпілеўскі, П. Беларусь у абрадах і казках / П. Шпілеўскі; пад рэд.
А. Вашчанкі. – Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2010. – 304 с.

2 Аверинцев, С. С. Мифы / С. С. Аверинцев, М. Н. Эпштейн // Литературный энциклопедический словарь / под общ. ред. В. Кожевникова, П. А. Николаева / редкол.: Л. Г. Андреев, Н. И.Балашов и др. – М.: Сов. энцикл., 1987. – 752 с.

3 Баршчэўскі, Я. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / уклад., пер. з польскае мовы і камент. М. Хаўстовіча. – Мінск: Маст. літ., 1990. – 383 с.

4 Наварыч, А. Рабкова ноч : аповесці, апавяданні / А. Наварыч; прадм.
А. Карпюка. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1988. – 247 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ